Зацвярджаю

Намеснік старшыні
арганізацыйнага камітэта
намеснік Міністра адукацыі
____________Р.С. Сідарэнка
____________2018 года

ЗАКЛЮЧНЫ ЭТАП XXXIV РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ
ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА»
І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Мазыр, 2018 г.*

## 11 клас

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | | | | | | | | | | | |

### Варыянт І

**Заданне 1.** Адным з прыкметных фанетычных адрозненняў беларускай мовы ад шэрагу іншых славянскіх моў (*рускай, польскай, балгарскай, сербскай* і інш.) з'яўляецца характар заднеязычнага звонкага гука. Так, у беларускай мове ў словах *галава*, *гара*, *нага* і многіх іншых літара «г» абазначае фрыкатыўны (працяжны) зычны гук, у адрозненне, напрыклад, ад рускай мовы, дзе ў адпаведных роднасных словах гэта літара адпавядае гуку змычнаму (выбухному).

Аднак і ў нашай мове зрэдку сустракаюцца словы, у якіх альбо згодна са старадаўняй традыцыяй, альбо ў выніку ўплыву суседніх гукаў на месцы літары «г» ці нейкай іншай прынята вымаўляць выбухны гук [г], што з'яўляецца нормай для літаратурнага вымаўлення.

Знайдзіце такія словы сярод змешчаных у табліцы і пастаўце насупраць іх знак «+». Словы, у якіх няма выбухнога [г], суправадзіце знакам «–».

*Максімальная колькасць балаў – 4* (0,5 бала – за кожны правільны адказ).

| | | | |
|---|---|---|---|
| *гекзаметр* | | *гонта* | |
| *агрэгат* | | *параграф* | |
| *геральдычны* | | *грувасткі* | |
| *экзэмпляр* | | *газнічка* | |

**Заданне 2.** У левым слупку табліцы прыведзены фрагменты запісаў пяці фразеалагізмаў. Дапоўніце іх прапушчаным дзеяслоўным кампанентам (для кожнага свaім), кіруючыся змешчаным побач значэннем. Запішыце гэты дзеяслоўны кампанент у патрэбнай граматычнай форме ў трэцім слупку адпаведнага радка.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| | | |
|---|---|---|
| *… ў амбіцыю* | ‘пакрыўдзіўшыся, бурна рэагаваць, выказваць нязгоду, незадавальненне’ | |
| *… слёзы* | ‘хто-небудзь паплаціцца за зробленае каму-небудзь зло, крыўду’ | |
| *хоць святых …* | ‘няма сіл цярпець што-небудзь; нязносна, нясцерпна для іншых’ | |
| *аж нос …* | ‘з вялікім апетытам і прагна (есці)’ | |
| *… жабу (жаб)* | ‘моўчкі, цярпліва зносіць крыўду, абразу, выслухоўваць непрыемнае’ | |

**Заданне 3.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

Степан Михайлович Багров, так звали его, был не только среднего, а даже небольшого роста; но высокая грудь, необыкновенно широкие плечи, жилистые руки, каменное, мускулистое тело обличали в нем силача. В разгульной юности, в молодецких потехах, кучу военных товарищей, на него нацеплявшихся, стряхивал он, как брызги воды стряхивает с себя коренастый дуб после дождя, когда его покачнет ветер *(По С. Т. Аксакову)*.

**Заданне 4.** Размяркуйце словы па графах табліцы ў адпаведнасці з тым, у якой марфеме знаходзіцца *ы*. Графічна вызначце гэту марфему.

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0, 5 бала за кожнае правільна размеркаванае слова і правільна вызначаную марфему).*

Збіраючы, трыма, унутры, двойчы, су́шы, пасцерагчы, сушы́, нічым, станцыя, папоўніцы.

**Узор:** Частка канчатка – *вядом-ыя*

| **ы ў складзе слова** | | |
|---|---|---|
| **Частка кораня** | **Словаўтваральны суфікс** | **Частка словаўтваральнага суфікса** |
| 1 | 2 | 3 |
| | | |
| | | |
| **Формаўтваральны суфікс** | **Частка формаўтваральнага суфікса** | **Частка канчатка** |
| 4 | 5 | 6 |
| | | |
| | | |

**Заданне 5.** У песні *«Сінь-васількі»* Я. Паплаўскай і А. Ціхановіча ёсць такія радкі: *«З неба, дзе сінь боскіх вышынь, сыплюцца зоркі на белы абрус, і ўсё ляцяць, крылам шумяць белыя лебедзі праз Беларусь»*. У словазлучэнні *белы абрус* прыметнік *белы* з'яўляецца якасным, а ў словазлучэнні *белыя лебедзі* – адносным. Запоўніце графы табліцы адпаведнымі словазлучэннямі.

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал за кожнае правільна складзенае словазлучэнне).*

| **Словазлучэнні з якаснымі прыметнікамі** | **Словазлучэнні з адноснымі прыметнікамі** |
|---|---|
| кіслая страва | ***кіслая*** |
| ***назіральны*** | назіральны пункт |
| ***тэатральны*** | тэатральны часопіс |
| лісіны твар | ***лісіны*** |
| ***сардэчны*** | сардэчны клапан |

**Заданне 6.** Вызначце, якімі непастаяннымі марфалагічнымі прыметамі характарызуюцца словы мовы ў сказе *Шляхі не купляюць за пяць капеек – бяруць іх жыццём сваім* (В. Зуёнак).

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала за правільна названыя прыметы).*

| **Слова** | **Непастаянныя марфалагічныя прыметы** | **Слова** | **Непастаянныя марфалагічныя прыметы** |
|---|---|---|---|
| **Узор:** *сіненькім* | *м. р, адз. л., Т. скл.* | **Узор:** *але* | *не мае* |
| шляхі | | капеек | |
| не | | бяруць | |
| купляюць | | іх | |
| за | | жыццём | |
| пяць | | сваім | |

**Заданне 7.** Рыхтуем падарунак – ***беларускі ручнік*** – сваімі рукамі:

*На ручніках, расшытых пеўнямі,*
*Хлеб-соль падносім для гасцей,*
*Вядзём за стол, каўшамі пеннымі*
*Частуем квасам пагусцей.*

А дапамогуць нам у гэтым аўтары кнігі *«Падарожжа ў горад майстроў»* В. Сцяпурка і С. Лафюк. Уважліва прачытайце *«інструкцыю»* – і ўсё атрымаецца. Праўда, у тэксце не хапае некаторых слоў. Аднавіце іх, запісаўшы патрэбныя назвы канструкцыйных частак ткацкага стану – *кроснаў*, на якіх мы і зробім наш ручнік. Неабходныя тэрміны (*а іх 5!*) выбірайце са слоўніка, прыведзенага ніжэй.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

Каб выткаць ручнік, спачатку падрыхтуйце *кросны.*



Для гэтага, па-першае, навіце доўгія ніткі – ***аснову*** тканіны для ручніка. Падзяліце ніткі на дзве часткі – верхнюю і ніжнюю.

Потым падрыхтуйце (?)__________________ – папярочныя ніткі. Для гэтага навіце іх на драўляную трубачку – (?)__________________. Яе ўстаўце ў (?)__________________.

Калі ўсё зрабілі, сядайце за кросны.

Паперамення націскайце нагамі на (?)__________________, каб памяняць месцамі верхнюю і ніжнюю часткі нітак.

Паміж ніткамі ўтвараецца праход, у які вы напраўляеце (?)__________________.

Нітачку з (?)__________________ акуратна кладзіце паміж ніткамі і прыціскайце (?)__________________ – спецыяльным грэбенем. Ніткі пераплятаюцца – і атрымліваецца тканіна для вашага ручніка.

## Слоўнік

| | |
|---|---|
| *аснова* | *пруг* |
| *бёрда* | *сукала* |
| *зева* | *уток* |
| *матавіла* | *цэўка* |
| *набіліцы* | *чаўнок* |
| *навоі* | |

**Заданне 8.** Няўважлівы даследчык пераблытаў ячэйкі табліцы *«Літаратура сярод відаў мастацтва»*. Выпраўце памылкі – суаднясіце паводле табліцы: **А)** назву літаратурнага напрамку, **Б)** літаратурную ілюстрацыю да яго і **В)** твор іншага віду мастацтва гэтага ж напрамку.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| | **Напрамак** | **Літаратурная ілюстрацыя** | **Іншы від мастацтва** |
|---|---|---|---|
| | **З** | **Б** | **В** |
| **1.** | рэалізм | *Ты зноўку маці, о Еўфрасіння,<br>Горада ўсіх жыхароў міласэрнасць,<br>Якая змагла ікону святую<br>Унесці здаля ў край Палачанскі.<br>З Царграда, куды з самога Эфесу<br>Цар дабраверны яе годна прынёс,<br>Зважаючы просьбам тваім шматлікім<br>Дзеля русінскіх краёў упрыгожання.* | В. Ваньковіч. «Адам Міцкевіч»<br> |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | *Схіліся да ног нябёс уладара<br>Ды не пазбаў нас вышняга дару.<br>Упрасі, каб ізноўку вернутай быць,<br>Іконе святой Полацк наш упрыгожыць.* | |
| **2.** | барока | *Якраз на бераг прывалілі,<br>За плот чаўнок свой прыкруцілі,<br>Па шклянцы выпілі сівухі,<br>Паелі нашча саладухі,<br>Камоў з смятанай і глазухі,<br>Пайшлі у горад пагуляць.<br>Бягуць, як батракі з прыгону,<br>А ім ў варотах тыц – Дыдона<br>Ды стала так на іх казаць…* | І. Староў, Ю. Фельтан, К. Бланк. Палац Румянцавых-Паскевічаў (Гомель)<br> |
| **3.** | іпрэсія-нізм | *Перад панам тым з Канева<br>Смела дзеўка стала,<br>Смела гледзячы у вочы,<br>Смела адказала:<br><br>– Дужы ты з сваім багаццем,<br>А я сілы большай, –<br>За мной праўда і народ мой,<br>За табой жа грошы!* | «Полацкі сшытак» (XVII-XVIII ст.)<br> |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | *Чым з табою піць, гуляці,*<br>*Ночкі каратаці, -*<br>*Лепш навекі косці парыць*<br>*У зямельцы-маці!* | |
| **4.** | раман-тызм | *Матка прандзей з хаты ў сені,*<br>*Як бы цівун гнаў па карку,*<br>*Усё шэпча то імене:*<br>*«Аліндарку, Аліндарку!»*<br>*Прыляцеўшы так дадому,*<br>*За калыску узялася*<br>*І зрадзела, як святому,*<br>*Што аж слязьмі залілася.*<br>*І калыша, і галосе:*<br>*Надта імя спадабала,*<br>*Надта добрае здалося,*<br>*Што такога і не знала!* | М. Філіповіч. «На Купалле»<br> |
| 5. | класі-цызм | А вакол плакалі пралескі, дзеці вясны...<br>Прытуліся ка мне<br>Прытуліся ка мне, дзяўчынка каханая! –<br>бо сонейка заходзіць,<br>бо цені гусцеюць і каля млына над возерам устае,<br>быццам белая воўна, пахучы туман... /…/<br>Нешта таемнае варожыць мне вячэрняя зорка...<br>Сэрца маё ператлумачыць сабе ўсе гэтыя дзіўныя малюнкі. | І. Хруцкі. Нацюрморт<br> |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | Цені кладуцца над вёскай, цені гусцеюць на канюшыне за пусткай, і нейк робіцца сумна-сумна… /…/ Здаецца, ляцім з табою дзесьці далёка-далёка за рэчкай… | |

**Правільныя адказы:**

А1 (Рэалізм) **Б**_____, **В**_____.
А2 (Барока) **Б**_____, **В**_____.
А3 (Імпрэсіянізм) **Б**_____, **В**_____.
А4 (Рамантызм) **Б**_____, **В**_____.
А5 (Класіцызм) **Б**_____, **В**_____.

**Заданне 9.** Прачытайце ўрыўкі з літаратуразнаўчых прац. Пазнайце, пра якога мастака слова гаворыць даследчык. Запішыце імя і прозвішча.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**1.** Ад славутага «Мужыка» да наступнай публікацыі (в. «Касцу» – «Наша Ніва», 1907) зноў прамінаюць цэлыя два гады. Наколькі напружаным, плённым і інтэнсіўным у плане светапогляднага росту быў гэты перыяд для маладога паэта, ускосна сведчаць два творы, напісаныя напрыканцы 1906 г. Гэта вершы-прысвячэнні – «Нашай долі» і «Беларускай выдавецкай суполцы «Загляне сонца і ў наша ваконца». /…/ Як вядома, да польскамоўных твораў аўтар звяртаўся і пазней, у 1904–1906 г. Ён перапісваў, а магчыма, і пісаў іх (*Г.К. Тычко*).

**2.** У партызанскім цыкле аповесцей з асаблівай сілай выявілася праблема трагічннага, адвечная тэма выбару ў складаных умовах акупіраванай тэрыторыі партызанскай барацьбы. Не менш востра пісьменнік паказаў падзеі калектывізацыі, да якіх упершыню звярнуўся ў аповесці «***». У беларускай літаратуры ніхто так аголена-праўдзіва, з болем, абгрунтавана не паказаў бессэнсоўнасць, жорсткасць сталінскіх метадаў абагульнення сялянскіх гаспадарак. Гэту тэму пісьменнік працягнуў у аповесці «Аблава», дзе /…/ упершыню ў беларускай літаратуры паказвае спецперасяленца, працавітага, гаспадарлівага селяніна Хведара Роўбу (*Л.С. Савік*).

**3.** Вершы паэта, напісаныя ў Сібіры, – гэта і голас пакуты, і сімвал веры, і споведзь, скарга выгнанніка, а таксама сведчанне нязломнай, непахіснай вытрымкі. І разам з тым – шчымлівае, неадольнае пачуццё духоўнае сувязі з роднаю зямлёй. /…/ *** увайшоў у літаратуру і як выдатны празаік. Яго проза надзейна абапіралася на нацыянальныя традыцыі літаратурнага і бытавога апавядання… Адметны талент *** паспеў выявіцца і ў драматургіі, публіцыстыцы. У 1920 г. ён апублікаваў зборнік «Жывыя казкі», куды ўвайшлі тры п'ескі для дзіцячага тэатра (*У.М. Казбярук*).

**4.** Жыццё беларускага народа напярэдадні і ў гады першай буржуазнай рэвалюцыі, пошукі перадавой інтэлігенцыяй шляхоў да народа, яе роля ў фарміраванні сацыяльна-палітычных поглядаў сялянства знайшлі сваё глыбокае мастацкае ўвасабленне першых

дзвюх кнігах «Палескіх аповесцей», якія пазней увайшлі ў трылогію, якая стала хрэстаматыйнай (*М.Д. Мацюх, М.І. Мушынскі*).

**5.** Да паўстання 1863–64 выяўляў асаблівую цікавасць, аб чым сведчаць яго апавяданні, пралог да рамана «***», драмы і многія вершы. Раман «***» займае цэнтральнае месца ў творчасці пісьменніка. Гэта, па сутнасці, першы беларускі гістарычны раман. /…/ Твор вызначаецца рамантычнай акрыленасцю і жыццёвай дакладнасцю, мастацкай культурай і патрыятычным пафасам, незвычайнай пазнавальнасцю і гуманістычным зместам. Роля пісьменніка ў беларускай літаратуры такая, як В. Скота ў англійскай ці Г. Сянкевіча ў польскай (*А.Л. Верабей*).

**Правільныя адказы:**

| | |
|---|---|
| **1:** | |
| **2:** | |
| **3:** | |
| **4:** | |
| **5:** | |

**Заданне 10. Складзіце** метрычную схему радкоў народнай песні *«Ехаў Ясь на кані»*, не зважаючы на яе музычнае ўвасабленне. Напрыклад:

*Вочы мае чорныя,*
*чорныя, чорныя:*

_́ _ _ _́ _́ _ _
_́ _ _ _́ _ _.

Самастойна **напішыце** ў працяг яшчэ адну (*уласную*) страфу, вытрымліваючы рытмічны малюнак песні.

*Максімальная колькасць балаў* – **5.**

**1. Метрычная схема:**

*Цячэ рэчанька, цячэ быстрая –*
*Скочу, пераскочу.*
*Аддай, мамачка, аддай, родная,*
*За каго я хочу.*

**1. Уласная страфа:**